А. І. Сушчэня

# АБАРОНЧЫЯ БАІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ Ў РАЁНЕ ГОРАДА БАРЫСАВА ЛЕТАМ 1941 Г.

*Даклад прысвечаны аналізу ваеннай сітуацыі ў Беларусі ў пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны і ролі абароны г. Барысава ў затрымцы прасоўвання войск праціўніка.*

Да канца чэрвеня 1941 г. абстаноўка на цэнтральным участку савецка-германскага фронту была крытычнай для Чырвонай Арміі. Асноўны сілы Заходняга фронту апынуліся ў акружэнні на захад ад Мінска. На Барысаўскім кірунку ўтварыўся аператыўны ваккум, які трэба было запоўніць.

Сілы СССР складалі: зводны атрад Барысаўскага гарнізона (да 7681 чал.) пад камандаваннем начальніка Барысаўскага танкавага вучылішча дывізіённага камісара І. З. Сусайкова і палкоўніка А. І. Лізюкова; 1-я Маскоўская мотастралковая дывізія пад камандаваннем палкоўніка Я. Р. Крэйзера (прыкладна 10955 чалавек асабістага складу; каля 245 танкаў, у тым ліку Т-34 і КВ-1). З боку Германіі наступала 18-я танкавая дывізія (47-ы матарызаваны корпус, 2-я танкавая група) пад камандаваннем генерал-маёра В. Нерынга (каля 218 танкаў) [1; 3].

У перыяд 27-30 чэрвеня 1941 г. вялася падрыхтоўка да абароны. 30 чэрвеня перадавыя часткі 18-й танкавай дывізіі праціўніка выйшлі да заходняй ускраіны Барысава (Нова-Барысаў). Мост быў замініраваны, але не ўзарваны, бо яшчэ меркаваўся адыход савецкіх войск [1; 2; 3].

На працягу вечара 1 ліпеня, ночы і раніцы 2 ліпеня часткі 18-й танкавай дывізіі праціўніка вялі бой за мост і плацдарм. Сюды падыйшлі 52-гі пяхотны полк і дадатковыя танкавыя часткі, узвод пяхоты прабіўся праз савецкую абарону і штурмаваў аўтадарожны мост, застаўшы знянацку каманду мінёраў, перш чым тыя паспелі актывізаваць узрывальнікі.

Да 12:00 2 ліпеня 1941 г. 1-я Маскоўская мотастралковая дывізія выйшла ў раён Барысава на рацэ Беразіна, дзе прыняла сваё баявое хрышчэнне і на працягу 2-4 ліпеня вяла разлютаваныя баі за горад. Часткі дывізіі на працягу паўсутак утрымлівалі пераправу. Па савецкіх дадзеных, страты нямецкай 18-й танкавай дывізіі 47-га матарызаванага корпуса, якая прарвалася праз неўзарваны мост праз Беразіну, склалі 1 і 2 ліпеня – 15 і 13 танкаў адпаведна. Да зыходу 2 ліпеня нямецкая 18-я танкавая дывізія пашырыла перадмостны плацдарм у глыбіню да 8 км і па фронце да 12 км, і часткі 1-й Маскоўскай мотастралковай дывізіі вымушаны былі адысці [1].

3 ліпеня па загадзе камандуючага 20-й арміяй генерал-лейтэнанта П. А. Курачкіна 1-я Маскоўская мотастралковая дывізія нанесла контрудар па шашы на Борысаў: уздоўж аўтастрады высунуўся 12-ы танкавы полк, узмоцнены ротай цяжкіх танкаў КВ-1, а з флангаў наступалі мотастралкі. У раёне Неманіца, Стайкі адбыўся буйны танкавы бой, у якім прынялі ўдзел больш за 200 танкаў абапал. У ходзе баёў вермахт страціў да 60-70 танкаў. Аднак і страты 1-й Маскоўскай мотастралковай дывізіі аказаліся значнымі, у тым ліку з-за актыўных дзеянняў нямецкай авіяцыі. Савецкія танкісты і мотастралкі пасунулі праціўніка да перапраў, але выбіць праціўніка з Барысаўскага плацдарма і ліквідаваць прарыў не змаглі. На наступны дзень 1-я Маскоўская мотастралковая дывізія перайшла да рухомай абароны, адступіўшы на рубеж ракі Нача.

Да 10 ліпеня дывізія адступала з баямі ўздоўж шашы Масква–Мінск у напрамку да Оршы, стрымліваючы прасоўванне 18-й танкавай дывізіі вермахта да Смаленска. Калі 6 ліпеня часткі вермахта захапілі горад Талочын, было прынята рашэнне выбіць іх адтуль. Па савецкіх дадзеных, у ходзе гэтай аперацыі немцы страцілі 200 чалавек забітымі, было ўзята ў палон 800 салдат і афіцэраў, захоплена 350 аўтамабіляў і сцяг 47-га матарызаванага корпуса [1; 2; 3].

За час супрацьстаяння 18-й танкавай дывізіі і 1-й Маскоўскай мотастралковай дывізіі войскі другога стратэгічнага эшалону РККА паспелі заняць абарону па Дняпры, што ў далейшым прывяло да разлютаванай Смаленскай бітвы і першага значнага аператыўнага крызісу вермахта. Гэтыя баі з’яўляюцца прыкладам паспяховай рухомай абароны ў пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

### *Спіс літаратуры*

1. 1-я мотострелковая дивизия // Википедия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/. – Дата доступа: 12.02.2026.
2. Крейзер, Я. В боях между Березиной и Днепром / Я. Крейзер // Военно-исторический журнал. – 1966. – № 6 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.rkka.ru/oper/1msd/main.htm. – Дата доступа: 12.02.2026.
3. Крейзер, Я. Г. // Википедия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/. – Дата доступа: 12.02.2026.
4. Оборона Борисова // Википедия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/. – Дата доступа: 12.02.2026.

*Сушчэня Андрэй Ільіч*, студент 1 курса ВФ БГУИР, andrejsusena@gmail.com

*Навуковы кіраўнік: Мікалаева Людміла Віктараўна*, загадчык кафедры гуманітарных дысцыплін БДУІР, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, Mikalayeva@bsuir.by